# Быць грамадзянінам, а не звацца ім

## Чаму гэта не толькі добрае пажаданне, а і лозунг дня

Ці памятаеце вы, як і калі ўпершыню атрымалі дакумент, які засведчыў права лічыць сябе паўнапраўным грамадзянінам сваёй краіны? Упэўнены, для абсалютнай большасці землякоў, незалежна ад узросту, гэта быў хвалюючы і адказны момант, які запомніўся. Што да мяне, то выдатна памятаю той дзень, калі нам, дзесяцікласнікам звычайнай сельскай школы, урачыста ўручылі пашпарты грамадзян тады яшчэ СССР. У Дзень Канстытуцыі ў школьную актавую залу набілася паўнютка народу: настаўнікі, дзеці, бацькі. Запрасілі на ўрачыстасць людзей з мясцовай гаспадаркі, чые партрэты мы бачылі на Дошцы гонару ля калгаснай канторы. Чыесьці бабулі і дзядулі таксама пажадалі не прапусціць важную падзею ў жыцці сваіх унукаў. А яшчэ прыехалі «вялікія начальнікі» з абласнога цэнтра, пра што шэптам папярэдзіла нас класны кіраўнік.

Здавалася б, што тут надзвычайнага – падняцца на сцэну і атрымаць чырвоную кніжыцу, але хваляваліся мы, прызнацца, здорава. Гэта ж як экзамен, гэта як клятву даць перад людзьмі, якія з дзяцінства ведаюць цябе як аблупленага. Усё роўна быццам у адзін момант пасталець, адчуўшы сябе дарослым і адказным, каб быць ужо нароўні з тымі, хто ўважліва глядзіць на цябе з залы.

Выходзілі на сцэну па чарзе, пад гукі школьнага ансамбля. Спачатку тыя, хто адзначыўся поспехамі ў вучобе, актыўнасцю ў школьных справах, у спорце. Тады не задумваўся, чаму нас «ранжыравалі»:




**Падчас рэспубліканскай патрыятычнай акцыі «Мы – грамадзяне Беларусі» ў Савеце Рэспублікі свой першы пашпарт з рук спікера Наталлі Качанавай атрымалі 20 маладых грамадзян з розных рэгіёнаў краіны**

насамрэч не троечнікаў жа вылучаць наперад. Пазней прыйшло разуменне, якое значэнне мела тая «дробязь» для нашага грамадзянскага сталення, для ўсведамлення прыярытэтаў дзяржавы, якая шырока адчыняе дзверы перад тым, хто імкнецца з юных гадоў стаць яе дастойным грамадзянінам.

Тады нам шчыра сказалі шмат чаго слушнага і разумнага. Але ў памяці чамусьці засталіся словы настаўніка гісторыі, былога франтавіка. Звацца грамадзянінам і быць ім – гэта зусім не тоесныя паняцці, гаварыў сваім вучням любімы педагог. Быць – значыць найперш любіць родную краіну ўсім сэрцам, служыць ёй розумам і, калі спатрэбіцца, ахвяраваць нават уласным жыццём дзеля яе шчаслівай будучыні. Неаднойчы паранены, былы камандзір узвода аўтаматчыкаў добра ведаў, аб чым ён казаў і што меў на ўвазе.

Гэта традыцыя – уручаць юным грамадзянам іх галоўны дакумент-сведчанне прыналежнасці да краіны напярэдадні ці ў Дзень Канстытуцыі – на пэўным прамежку часу магла ператварыцца, скажам так, у нейкае дзяжурнае, нецікавае мерапрыемства. Таму я шчыра парадаваўся, калі ў 2004 годзе БРСМ выступіў з ініцыятывай патрыятычнай акцыі «Мы – грамадзяне Беларусі». Падчас яе 15 сакавіка па ўсёй краіне маладым грамадзянам уручаюць іх першы пашпарт. Гэта робіцца ўрачыста, кранальна і, несумненна, выклікае шчырыя эмоцыі не толькі падлеткаў, а і ўсіх удзельнікаў святочнай цырымоніі. Нядзіўна, што акцыя папулярная сярод моладзі і, па праўдзе кажучы, стала ўжо адной з галоўных патрыятычных традыцый нашай дзяржавы. Уласна, гэта заканамерна, бо, як вельмі дакладна адзначыла падчас акцыі «Мы – грамадзяне Беларусі» ў Савеце Рэспублікі спікер Наталля Качанава, «напэўна, няма ніводнай краіны, дзе так клапаціліся б аб падрастаючым пакаленні». «Таму што мы разумеем, што гэта будучыня нашай краіны, – падкрэсліла старшыня Савета Рэспублікі. – І тое, якой наша краіна будзе ў будучыні, залежыць ад вас – ад тых, хто сёння вучыцца ў навучальных установах: у школах, каледжах, ліцэях, ВНУ. І вельмі важна, каб вы, падрастаючы, сфарміравалі дакладнае ўяўленне аб тым, што наша краіна – найлепшая. Яна сапраўды такая, і мы па праву ёй можам ганарыцца». Наталля Качанава запэўніла маладых грамадзян: «Мы зробім усё і будзем рабіць у далейшым для таго, каб вам жылося камфортна на нашай роднай зямлі».




Асаблівасцю сёлетняга Дня Канстытуцыі з'яўляецца тое, што ўжо год краіна жыве па абноўленым Асноўным Законе. У Год міру і стварэння гэта свята, на мой погляд, набыло асаблівую значнасць. Чаму? Адказ відавочны. Наша Канстытуцыя як агромністы парасон у неспакойным свеце надзейна захінае нас ад любых варожых інтрыг, гарантуе такія магчымасці для мірнага і стваральнага жыцця, пра якія людзі ў многіх краінах толькі мараць. Што павінны мы? Будаваць сваё жыццё ў роднай Беларусі і быць яе дастойнымі грамадзянамі. Быць, а не звацца. Трымацца разам, быць адзінымі і згуртаванымі. Цешу сябе надзеяй, што і маладыя грамадзяне, якія атрымалі свае першыя пашпарты ў такі важны дзень, таксама гэта ўсведамляюць. Як і сваю адказнасць перад краінай і яе законамі, асноўны з якіх – наша Канстытуцыя. Усё ж такі яны ўжо паўнапраўныя грамадзяне Рэспублікі Беларусь.

***Ігар ГАНЧАРУК***